**ХЛЕЎНІК**, Х л я ў н і к, сядзібны дух, які жыве ў хляве, часам разам з Хляўніцаю. Х. мае свае асаблівасці характару, звычкі, дзівацтвы і можа не толькі спрыяць сваёй гаспадарцы, але і шкодзіць. Улетку і ўзімку Х. заўсёды сядзіць у заднім куце хлява ці на бэльцы, курыным седале, назірае за скацінаю, праводзіць яе да парога і зноў вяртаецца на сваё месца. Найбольш любімую жывёліну Х. можа суправаджаць, куды б яна ні адлучалася, нават у палявую агароджу ці чужы хлеў. Х. пераборлівыя: адзін не любіць вараных, другі шэрых, трэці двухжыльных коней, але ўсе яны не любяць стракатых і лапленых. Менавіта на такіх конях яны заязджаюць у хлеў і псуюць жывёлу. Пры сімпатыі да сваіх гаспадроў ці калі па густу масць жывёлы, Х. песціць і чысціць кожную скаціціну, заплятае коням грывы і хвасты, носіць ваду вёдрамі, падкладвае паболей корму, не дазваляе адным жывёлінам крыўдзіць другіх. У адваротым выпадку Х. кудлаціць і выдзірае поўсць, скручвае грывы і хвасты ў каўтуны, адштурхоўвае нелюбімых жывёлін ад корму і пераносіць да любімцаў. Х. звязаны з каровамі і коньмі (Канёўнік), рэдка займаецца авечкамі і ніколі — свіннямі і козамі, якіх ледзьве трывае ў хляве. Яшчэ неяк мірачыся з казою, Х. не церпіць казла, якога спецыяльна пасяляюць у хляве, каб вывесці Х. Ва ўсіх стасунках з жывёламі Х. застаецца нябачны і толькі зрэдку ўзнікае ў вобразе скурчанага худога чалавека, што нагадвае шкілет хлопчыка ў скуры дарослага. Х. можа дзейнічаць і ў цемры, і пры свечцы з сінім полымем, якую запальвае крэсівам і трутам. Згодна з павер'ямі, Х. псуе скаціну: уначы заезджвае ў стайні коней, ад чаго тыя худнеюць і могуць акалець, а таксама кароў, якія неўзабаве перастаюць даваць малако. Даведаўшыся, што завёўся ліхі Х., усяляк стараюцца яго выжыць. Абярэгам ад Х. лічылася забітая сарока, падвешаная над дзвярыма стайні. Не пераносіць Х. і жывую сароку, калі тая садзіцца на хлеў і сакоча, выдаючы яго прысутнасць, з-за чаго ён робіцца раз'юшаным, зрывае гнеў нават на любімых жывёлінах і, нарэшце, можа зусім сысці з хлява. Сродкам выгнання Х. служыла таксама канапляная пуга з адпаведнай колькасцю вузельчыкаў, адмыслова сплеценая і навязаная на асінавае пугаўё. Пасцёбваючы такою пугаю, кожную свойскую жывёліну пераганялі цераз жароўню (агонь) са словамі: «Пайшла, хіра (немач, хвароба, погань) на ўзвей вецер!». Калі Х. у гэты час сядзіць на адной з жывёлін, то ад пугі, агню і магічных слоў замовы ён пакідае статак у спакоі. Апатрапеічны сэнс несла і падвешаная над яслямі грамнічная свечка, наяўнасць якой не дазваляла Х. пранікнуць у хлеў. Згадваючы Х., ніколі не называлі ягонага імя, стараліся не глядзець на кут, бэлькі і шасты, дзе ён мог знаходзіцца. А перш чым іх кранурь, спачатку называлі гэтыя рэчы, каб папярэдзіць Х., які, прачнуўшыся знянацку, можа нарабіць нямала бяды. Працягласць жыцця Х. гэтакая ж, як і ў *Дамавіка*, аднак Х. раней за яго старэе, бо гніе ў брудным хляве і шмат церпіць ад паразітаў, што прыстаюць да яго ад жывёл. Калі Х. не дрэмле, то цярэбіцца, скідваючы паразітаў і закарэлы гной, ад чаго скура яго лысее. У неахайным неабароненым хляве Х. найбольш сядзіць у сваіх сховах і мала займаецца скацінаю, якая без яго догляду робіцца брудная. Вынікам помсты Х. ці ягонай пагібелі можа стаць паморак скаціны. Дзе Х. загінуў, там ніколі не будзе весціся свойская жывёла.

*Літ.*: Беларуская міфалогія. Мн., 2002. С. 35—39.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ